*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**22** СНЕЖНЯ 2007 г. СУБОТА
№ 244 (26109)
Кошт 440 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раджаство Хрыстова 25 снежня**

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сардэчна віншую вас з Раджаством Хрыстовым.*

*Гэта вялікае свята аб'ядноўвае і збліжае сем'і, пакаленні і народы ў імкненні да духоўнага пераўтварэння і абнаўлення, у жаданні дзяліцца адзін з адным цяплом.*

*Раджаство для мільёнаў людзей служыць вечным сімвалам чысціні, шчырасці, чалавечнасці і міласэрнасці. У цудоўныя дні Раджаства нашы сэрцы напаўняе вера, надзея і суперажыванне, якія натхняюць на добрыя справы, аказанне дапамогі ўсім, хто ў ёй мае патрэбу.*

*Няхай свята Раджаства надасць вам сілы для ажыццяўлення самых запаветных жаданняў і планаў. Няхай надыходзячы год парадуе новымі дасягненнямі, прынясе ў кожны дом спакой, узаемаразуменне, дабрабыт і любоў.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў у справах, шчасця і міру.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НАРАДЗІЎСЯ НАМ ХРЫСТУС ЗБАЎЦА

## *Пастырскі ліст на Нараджэнне Пана 2007 г.*

**Браты ў біскупскім і святарскім служэнні, кансэкраваныя асобы, дарагі верны народ!**

Сардэчна вітаю ўсіх вас і віншую са збаўчай урачыстасцю Нараджэння Пана ў год усеагульнага паклікання да святасці!

Хто ж Ён, народжаны ў бэтлеемскай стаенцы Збаўца?

Аўтары Новага Запавета, з аднаго боку, прапануюць нам адказ на гэтае пытанне, карыстаючыся паняццямі таго часу, з другога ж — гэты адказ надзвычай багаты ў тэалагічным вымярэнні.

«Збаўца з'яўляецца «спадкаемцам усяго» (Гбр 1, 2), — піша аўтар паслання да Габрэяў. Паняцце спадчыны мела вялікае значэнне на старажытным Усходзе. Спадкаемца — гэта той, хто ўвасабляе гаспадара і яго справы; ён мае роўныя з ім правы. Таму апостал Ян Багаслоў у сваім Евангеллі кажа, што Збаўца «прыйшоў да свайго» *(пар. Ян 1, 11).*

Бог стварыў свет праз свайго Сына. «Усё праз Яго сталася» *(Ян 1, 3),* — падкрэслівае святы Ян Багаслоў. Папа Бэнэдыкт XVI у сувязі з гэтым у сваёй энцыкліцы *Deus caritas est* (Бог ёсць любоў) кажа, што «ўвесь свет быў створаны дзякуючы моцы Яго творчага слова» *(пар. DCE 9).*

Увесь свет сваім існаваннем абавязаны Хрысту і скіраваны да Хрыста, бо толькі ў Ім ён знаходзіць падставу і сэнс свайго існавання.

Магчыма, для нас, людзей ужо XXI стагоддзя, гэтыя тэалагічна-філасофскія разважанні гучаць ужо не настолькі пераканаўча, як для хрысціянаў апостальскіх часоў. Аднак яны павінны дапамагчы нам зразумець і паглыбіць нашую ўпэўненасць у тым, што ў момант нараджэння Дзіцяці ў Бэтлееме здзейснілася штосьці непаўторнае. А менавіта, здзейснілася таямніца Богаўцелаўлення, і на свет прыйшоў такі доўгачаканы Збаўца; споўнілася прароцтва Ісаі: «валадарыць Бог твой! (...) суцешыў Пан народ свой (...). Пан адкрыў святое плячо сваё перад вачыма ўсіх народаў» *(Іс 52, 7. 9. 10).* Такім чынам, чалавечая гісторыя атрымала новую якасць — яна абагавілася, у ёй з'явіўся Бог з чалавечымі абліччам і сэрцам; Бог, блізкі да людзей.

У калядную вігілію мы збіраемся за адным сталом, каб падзяліцца аплаткаю і пажадаць адно аднаму супакою, шчасця, радасці. Менавіта за агульным вігілійным сталом асаблівым чынам перажываецца таямніца супакою, якім Бог адорвае людзей добрай волі *(пар. Лк 2, 14).*

З гэтаю атмасфераю душэўнага супакою мы прыходзім у нашыя касцёлы, каб нанава перажываць таямніцу Богаўцелаўлення і ўслухацца ў тое, чаму вучыць нас урачыстасць Нараджэння Пана.

У першую чаргу яна кажа пра рэальнасць уваходжання Бога ў гісторыю чалавека і пра Божую любоў да яго, любоў да свету, у якім чалавек жыве.

У цяжкія моманты нашага жыцця мы часта забываемся, што менавіта Сын Божы прыйшоў у гэты свет і прыняў на сябе чалавечыя пакуты, прыняў чалавечую долю і нядолю. Сын Божы на ўласным вопыце ведае, што кожны з нас перажывае і з чым не можа справіцца. Таму без боязі, што нас не зразумеюць, мы можам звяртацца да Яго, можам шукаць у Яго выйсця з цяжкай сітуацыі і дапамогу.

Мы не можам забыцца пра тое, што праз уваходжанне Сына Божага ў чалавечую гісторыю Ён асвяціў і ўзвысіў да збавеннай годнасці дзейнасць чалавека. Мы павінны памятаць пра гэта, распачынаючы кожны новы дзень, бо дзякуючы Нараджэнню Хрыста нашая дзейнасць набыла новае і найвышэйшае з усіх магчымых вымярэнне.



Сённяшняя ўрачыстасць таксама кажа нам пра ўзвышэнне і хвалу простых людзей. Бо першымі, каму была дадзена ласка ўбачыць нованароджанага Збаўцу і пакланіцца Яму, былі не кіраўнікі ізраэльскага народа, не фарысеі, не старазапаветныя святары, не моцныя гэтага свету, а простыя пастухі.

Менавіта яны першымі прынялі вестку пра нараджэнне Збаўцы і паверылі ёй. Менавіта іх, непрыкметных у ценю моцных і слаўных гэтага свету, узвялічыў Пан Бог і пра іх апавядае Евангелле, якое будзе абвяшчацца да канца часоў.

У сувязі з гэтым мы павінны сёння запытацца ў саміх сябе: а якое нашае стаўленне да евангельскай весткі? Як мы сёння ўспрымаем Добрую Навіну, у тым ліку і пра Нараджэнне Хрыста? Ці цалкам мы яе прымаем? А можа, мы гатовыя прыняць з яе толькі тое, што адпавядае нашаму спосабу мыслення ці секулярнай культуры сучаснага свету? Мы маем перад сабою дзве магчымасці: прыпадобніцца да цара Ірада, які жадаў знішчыць усё, што нагадвала пра Хрыста, ці па прыкладзе бэтлеемскіх пастухоў паверыць і прыняць Добрую Навіну пра збаўленне.

І нарэшце, сённяшняя ўрачыстасць гаворыць нам, што важна не тое, як і дзе нарадзіўся чалавек, а тое, як ён жыве. Збаўца прыйшоў на гэты свет у крайняй галечы, Яму не знайшлося нават месца ў заездзе *(пар. Лк 2, 7).* Аднак Хрыстус сваім жыццём паказаў, што вартасць чалавека вызначаюць каштоўнасці, якія ён вызнае і нясе ў сабе. У гэтым сэнсе Хрыстус пакінуў нам найлепшы прыклад для пераймання.

Таму Нараджэнне Пана — гэта нібы лекцыя для нас. Лекцыя, якая павінна перасцерагчы ад падзення з высокага п'едэсталу, на які мы самі сябе ўзносім. Гэта лекцыя пакоры для нас — людзей, якія, жывучы ў эпоху постмадэрнізму, спадзяюцца толькі на ўласныя сілы, на рацыянальны розум, на дасягненні навукі і тэхнікі. Гэта, нарэшце, лекцыя вытрымкі ў імкненні да дасканаласці.

У Хрысце матэрыяльны свет атрымаў свой цэнтр. У ім свет атрымаў «Жыццё» і «Святло». «А святло свеціць у цемры» *(Ян 1, 5),* і гэта азначае, што «Жыццё» прабілася ў наш свет праз акасцянелую і закарэлую паверхню. Таму чалавек ужо не павінен навобмацак шукаць чагосьці невядомага, пра што нічога не ведае. Ён не павінен уцякаць ад рэальнасці жыцця, бо ў Хрысце яно перастала быць цёмнаю пусткаю без сэнсу. Для чалавека скончыўся шлях у невядомае, і ён у Хрысце атрымаў сваю мэту. Бог выйшаў насустрач чалавеку, дзякуючы чаму чалавек адчувае сябе ў гэтым свеце бяспечна, як у сябе дома, бо тут яго сустракае бязмежная любоў Бога. Жыццё чалавека набыло сэнс. Таму ўцёкі ад рэальнасці былі б уцёкамі ў бессэнсоўнасць.

Умілаваныя ў народжаным Збаўцы браты і сёстры!

Ад усяго сэрца віншую вас з Божым Нараджэннем! Віншую іншыя хрысціянскія Цэрквы і супольнасці, якія разам з намі святкуюць гэтую збавенную ўрачыстасць. Віншую вернікаў Беларускай Праваслаўнай Царквы, якія праз трынаццаць дзён будуць ушаноўваць Нараджэнне Збаўцы, і жадаю ім як найлепш падрыхтавацца да гэтага свята.

Усе мы, хрысціяне розных Цэркваў і супольнасцяў, вызнаем тую ж самую праўду пра Богаўцелаўленне, што стала знакам прыйсця ў свет Бога ў вобразе чалавека, які аднавіў парушаную першародным грахом гармонію. Хрыстус, стаўшы цэнтрам чалавечай гісторыі, для ўсіх нас з'яўляецца таксама цэнтрам прыцягнення.

Гэта — імператыў, які абавязвае нас да новага бескампраміснага, пазбаўленага «рэлігійнай паліткарэктнасці» абвяшчэння праўды Евангелля і да абароны маральных каштоўнасцяў з мэтаю стварэння цывілізацыі любові і пабудовы грамадства, заснаванага на ўзаемнай павазе, узаемнай любові, справядлівасці і абяцаным Збаўцам супакоі.

Ад усяго сэрца жадаю вам Божых ласкаў, здольнасці і сілаў перанесці на ўсе дні вашага жыцця атмасферу сённяшняга свята, атмасферу любові, супакою і адзінства.

Радасці вам, шчасця, шчодрага Божага благаслаўлення на святы Божага Нараджэння і калядны перыяд, а таксама на ўвесь надыходзячы Новы 2008 год, які ў душпастырскай праграме Каталіцкага Касцёла на Беларусі будзе праходзіць пад дэвізам: «Слова Божае — крыніца надзеі». Выбіраючы такую тэму, наш мясцовы Касцёл імкнецца больш поўна ўдзельнічаць у жыцці Паўсюднага Касцёла. Гэта звязана з тым, што 28 чэрвеня 2008 г. распачынаецца Год святога апостала Паўла, які нястомна абвяшчаў Евангелле ўсім народам, а ў кастрычніку ў Ватыкане распачне працу чарговы Сінод Біскупаў, прысвечаны слову Божаму ў жыцці і місіі Касцёла. Святы Айцец Бэнэдыкт XVI у сваёй апошняй энцыкліцы Spe salvi (У надзеі мы збаўленыя) заклікае ўслухацца ў сведчанне Бібліі пра надзею, бо сапраўды слова «надзея» з'яўляецца цэнтральным словам біблейскай веры *(пар. SS 2).*

Яшчэ раз, браты і сёстры, са святам, з Нараджэннем Хрыстовым! Даручаючы ўсіх вас заступніцтву Багародзіцы Марыі, якая нарадзіла свету Збаўцу, я дзялюся з вамі аплаткаю на знак еднасці, і ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца і Сына, і Духа Святога. Амэн.

**Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ**
**Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.**

## Прэзідэнт Беларусі лічыць недастатковымі меры па развіцці льняной галіны рэспублікі

Дадатковыя меры па развіцці льняной галіны рэспублікі будуць абмеркаваны на нарадзе ў Прэзідэнта Беларусі. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка даручыў падрыхтаваць нараду, на якой будзе прааналізавана сітуацыя ў краіне з ільнасеяннем, перапрацоўкай ільноваланка для выпрацоўкі неабходнага комплексу мераў па паляпшэнні сітуацыі ў гэтай сферы.

Аб некаторых пытаннях развіцця аграпрамысловага комплексу краіны ішла размова ў час рабочай сустрэчы Прэзідэнта з намеснікам прэм'ер-міністра Іванам Бамбізам. У рэспубліцы працуе 49 заводаў па апрацоўцы лёну, 305 сельскагаспадарчых арганізацый займаецца льнасеяннем. Усяго ў названай галіне занята каля 12 тыс. чалавек, у тым ліку каля 6 тыс. — на Аршанскім ільнокамбінаце.

Кіраўніку дзяржавы далажана аб рэалізацыі даручэнняў па вытворчасці льнотрасты, перапрацоўцы льноваланка, а таксама аб стане спраў на Аршанскім ільнокамбінаце. Развіццё льняной галіны з'яўляецца перспектыўным напрамкам сельгасвытворчасці. На сусветным рынку з году ў год расце попыт на натуральныя валокны. Так, за апошнія пяць гадоў спажыванне хімічных валокнаў павялічылася на 18 працэнтаў, шоўку і бавоўны — на 10 працэнтаў, спажыванне ж ільноваланка вырасла на 55 працэнтаў. Аднак, паводле слоў Івана Бамбізы, у Беларусі склалася няпростая эканамічная сітуацыя ў гэтай галіне, і для яе эфектыўнага вырашэння неабходна дзяржаўная падтрымка.

Для эканамічна эфектыўнага развіцця галіны ўраджайнасць лёну павінна складаць не менш як 8—9 ц/га. У рэспубліцы ж гэты паказчык не перасягае 6—7 ц/га. Для якаснай вытворчасці лёну неабходна палепшыць тэхнічную аснашчанасць гаспадарак. Нягледзячы на ўвагу з боку дзяржавы, што ўдзяляецца гэтай сферы, у рэспубліцы пакуль няма сучаснага льнасеяльнага агрэгата беларускай распрацоўкі, толькі пачата вытворчасць айчынных самаходных ільноўборачных камбайнаў.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 60-годдзем Беларускае таварыства «Веды»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 60-годдзем Беларускае таварыства «Веды». Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Таварыства «Веды» ўнесла дастойны ўклад у выхаванне ў шырокіх мас насельніцтва пачуцця патрыятызму, грамадзянскага абавязку і сацыяльнай справядлівасці, што садзейнічала кансалідацыі беларускай грамадскасці, — гаворыцца ў віншаванні. — Сёння перад намі стаяць маштабныя задачы рэалізацыі стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь». Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што таварыства «Веды» і ў далейшым будзе служыць высакароднай справе захавання і прымнажэння інтэлектуальнага патэнцыялу, якім заўсёды славілася Беларусь.

## Сяброўская сустрэча з навуковым накірункам

**Добрай нагодай для чарговай сустрэчы членаў «Беларускага таварыства «Веды» стала святкаванне ў гэтыя дні арганізацыяй свайго 60-годдзя.**

На ўрачыстых мерапрыемствах сярод 600 запрошаных гасцей былі не толькі сучасныя супрацоўнікі «Веды», але і тыя, хто ўжо скончыў сваю працу там. У часы Савецкага Саюза грамадскае аб'яднанне «Веды» ў Беларусі было адзіным. Пасля распаду Саюза пачало драбіцца і аб'яднанне, але традыцыя сустракацца на такіх важных падзеях засталася. Павіншаваць адкрытае грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства «Веды» прыйшлі прадстаўнікі ўлады Беларусі, а таксама члены аб'яднанняў «Веды» з краін СНД.

**Вольга ЛАСКА.**

## Новыя двухбаковыя пагадненні аб узаемных паездках грамадзян

З 21 снежня паміж Беларуссю і Польшчай, а таксама Беларуссю і Літвой часова прымяняюцца новыя двухбаковыя пагадненні аб узаемных паездках грамадзян.

З 21 снежня Літва і Польшча ўступаюць у Шэнгенскую зону, а дзеючыя двухбаковыя пагадненні ў гэтай сферы не адпавядаюць патрабаванням адзінай візавай палітыкі Еўрапейскага саюза. У сувязі з гэтым Прэзідэнт Беларусі адобрыў заключэнне шляхам абмену нотамі і часовае прымяненне з 21 снежня 2007 года міжнародных дагавораў з Літвой і Польшчай па пытаннях узаемных паездак грамадзян.

Як расказаў карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў, гэтыя дакументы прадугледжваюць больш спрыяльны ў параўнанні з шэнгенскім парадак атрымання візаў грамадзянамі нашай краіны. У прыватнасці, пагадненнем з Польшчай прадугледжваецца бязвізавы рэжым адносна асобаў, якія маюць дазвол на пастаяннае пражыванне (пасведчанне на права жыхарства), членаў экіпажаў паветраных і грамадзянскіх марскіх суднаў, уладальнікаў дыпламатычных пашпартоў (тэрмінам да 30 дзён), а таксама асобаў, якія атрымалі пасведчанні на вяртанне ў краіну грамадзянскай прыналежнасці (пастаяннага пражывання).

Права на атрыманне бясплатных візаў будуць мець дзеці да 6 гадоў, школьнікі, студэнты, аспіранты і настаўнікі, што іх суправаджаюць, а таксама вучоныя, якія накіроўваюцца з мэтай правядзення навуковых даследаванняў. Гэта стандартныя катэгорыі, права якіх на атрыманне бясплатных шэнгенскіх візаў вызначана шэнгенскім заканадаўствам.

Акрамя таго, пагадненне з Польшчай дапоўнена пералікам, куды ўвайшлі ўдзельнікі мерапрыемстваў культурнага, навукова-тэхнічнага і спартыўнага характару — візы гэтым катэгорыям грамадзян таксама будуць афармляцца бясплатна на парытэтнай аснове. Магчымасць афармляць шматразовыя візы тэрмінам да аднаго года з выплатай консульскага збору прадугледжваецца для персаналу чыгунак абедзвюх дзяржаў пры наяўнасці адпаведных хадайніцтваў упаўнаважаных органаў, для паездак у мэтах падтрымкі сваяцкіх сувязяў, для ўдзельнікаў абменаў па лініі дзяржаўных органаў, для вадзіцеляў і членаў экіпажаў аўтатранспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць міжнародныя перавозкі.

Пагадненне з Польшчай прадугледжвае скарачэнне з 10 да 5 рабочых дзён тэрмін разгляду візавых хадайніцтваў. У экстранных выпадках (цяжкая хвароба або смерць блізкіх сваякоў і членаў сям'і), а таксама асобам, якія маюць патрэбу ў медыцынскай дапамозе, і іх суправаджаючым, членам афіцыйных дэлегацый, двухбаковых міжурадавых камісій і рабочых груп, арганізатарам і ўдзельнікам выставак, кірмашоў, эканамічных канферэнцый і семінараў візы будуць выдавацца на працягу 3 рабочых дзён.

Пагадненнем з Літвой захоўваецца бязвізавы рэжым паездак для грамадзян, якія маюць дазволы на пастаяннае пражыванне на тэрыторыі Беларусі і Літвы, а таксама адносна членаў экіпажаў паветраных і марскіх суднаў. Прадугледжана магчымасць атрымання бясплатнай візы ў тэрміновым парадку па паведамленні аб цяжкай хваробе або смерці блізкага сваяка і члена сям'і, а таксама спецыялістам чыгуначнага транспарту, якія расследуюць выпадкі парушэння бяспекі руху.

Дакумент з Літвой таксама прадугледжвае магчымасць афармлення шматразовых візаў тэрмінам да 3 гадоў дзецям да дасягнення паўналетняга ўзросту (16 гадоў), асобам ва ўзросце 65 гадоў і старэйшым і інвалідам I групы. Акрамя таго, будуць выдавацца бясплатныя візы тым катэгорыям грамадзян, якія маюць на гэта права ў адпаведнасці з шэнгенскім заканадаўствам. Гэта дзеці да 6 гадоў, школьнікі, студэнты, аспіранты і настаўнікі, што іх суправаджаюць, а таксама вучоныя, якія накіроўваюцца з мэтай правядзення навуковых даследаванняў.

## ЗАРПЛАТА Ў ЛІСТАПАДЗЕ — BR736 ТЫС. 386

Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў лістападзе 2007 года склала Br736 тыс. 386, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Гэты паказчык у кастрычніку гэтага года складаў Br738 тыс. 19.

Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у лістападзе гэтага года склала Br756 тыс. 64 (у кастрычніку яна была Br756 тыс. 537).

## Пасол Беларусі перадаў польскаму боку ноту аб часовым прымяненні двухбаковага Пагаднення аб узаемных паездках грамадзян

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка 20 снежня перадаў польскаму боку ноту Міністэрства замежных спраў Беларусі аб заключэнні і часовым прымяненні з 21 снежня міжурадавага беларуска-польскага Пагаднення аб узаемных паездках грамадзян. У адпаведнасці з пагадненнем візы будуць выдавацца, як правіла, на працягу 5 рабочых дзён, у экстранных выпадках — на працягу 3 рабочых дзён, а таксама неадкладна грамадзянам па паведамленнях аб цяжкай хваробе або смерці блізкага сваяка або члена сям'і. Пачынаючы з 22 снежня 2007 года консульскія ўстановы Беларусі ў Польшчы будуць браць за выдачу віз грамадзянам Рэспублікі Польшча наступныя консульскія зборы: за транзітную візу — 10 еўра, за аднаразовую візу — 25 еўра, за двухразовую візу — 35 еўра, за шматразовую візу (тэрмінам знаходжання да 90 дзён) — 60 еўра. Ад аплаты консульскага збору за выдачу візаў у адпаведнасці з пагадненнем вызваляюцца дзеці да 6 гадоў, навучэнцы, студэнты, аспіранты, якія выязджаюць у мэтах навучання ў ВНУ або на курсах, вучоныя, што выязджаюць з мэтай правядзення навуковых даследаванняў, а таксама ўдзельнікі мерапрыемстваў культурнага, навукова-тэхнічнага, спартыўнага характару. У час сустрэчы ў МЗС Польшчы беларускі бок зноў прапанаваў пачаць перагаворны працэс па заключэнні Пагаднення аб паездках прыгранічнага насельніцтва, якое магло б прадугледжваць спрошчаны парадак перасячэння беларуска-польскай граніцы для жыхароў прыгранічных тэрыторый дзвюх краін.

**БЕЛТА.**

## Беларусь не плануе ў 2008 годзе прадаваць акцыі буйных прадпрыемстваў нафтахімічнага комплексу

Аб гэтым заявіў намеснік міністра эканомікі Алег Мельнікаў на прэс-канферэнцыі, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.

Ён адзначыў, пакуль што ў планах на будучы год конкурсы па продажы акцый такіх прадпрыемстваў, як «Нафтан» і «Палімір», не прадугледжаны.

Алег Мельнікаў таксама лічыць, што выдзяленне Беларусі расійскага стабілізацыйнага крэдыту ніяк не паўплывае на працэс актывізацыі ў рэспубліцы продажу пакетаў акцый.

Датэрміновы продаж «Газпраму» акцый «Белтрансгазу» не прадугледжваецца.

«Амкадор» купляе Мінскі эксперыментальны завод імя Гастэлы.

Беларусь вядзе перагаворы з расійскімі інвестарамі аб продажы дзяржпакета акцый МТС.

## На Ражство лёгкі марозік і мокры снег

У суботу ў асобных раёнах чакаецца мокры снег і дождж, раніцай туман. Тэмпература паветра ад мінус 2 да 2 цяпла. Тэмпература паветра ўначы 23 і 24 снежня будзе вагацца ад 5 марозу па паўднёвым захадзе да плюс 1 градуса па паўночным усходзе, удзень каля 0.

**Сяргей КУРКАЧ.**

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г.Минск, ул. Мясникова, 32, сообщает о проведении 27 декабря 2007 года внеочередного Общего собрания акционеров в заочной форме со следующей повесткой дня:

1. *Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций ОАО «АСБ Беларусбанк» четырнадцатой эмиссии.*
2. *Об увеличении размера уставного фонда ОАО «АСБ Беларусбанк».*
3. *О внесении изменений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».*

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (не позднее 25 декабря), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 27 декабря) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней — 25 декабря 2007 г.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 04.**

*УНП 100325912.*

## СВЯТОЧНЫ ГРАФІК АЎТОБУСАЎ

На міжгародніх маршрутах аўтобусы будуць курсіраваць 22, 29 снежня, 4 і 11 студзеня па графіку пятніцы. 23, 30 снежня, 5 і 12 студзеня — па графіку суботы. 24, 31 снежня, 1 і 6 студзеня — па графіку будных дзён (серады). 25 снежня, 2, 7 і 13 студзеня — па графіку нядзельных дзён. Аўтобусы прыгарадных маршрутаў збіраюцца прытрымлівацца 28 снежня і 11 студзеня графіка будных дзён (чацвярга). 22, 29 снежня, 4 студзеня і 12 студзеня — графіка пятніцы. 23, 30, 31 снежня і 5 студзеня — суботняга графіка. 24, 25 снежня, 1, 2, 6 і 7 студзеня — графіка нядзельных дзён.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## НАВУКА ЦАНОЙ У $323 ТЫСЯЧЫ

Праваахоўнікамі на аўтадарозе Мінск — Магілёў паблізу Беразіно былі затрыманы аўтамашыны, якія перавозілі з тэрыторыі Расіі нафтапрадукты — 140 тон дызельнага паліва і 32 434 літры бензіну нармаль-80 — па суправаджальных дакументах, якія не адпавядалі рэчаіснасці. Транспартныя сродкі і нафтапрадукты, агульным коштам 323 500 долараў канфіскаваны. Штраф — 28 мільёнаў рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.12.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 154,00 |
| 1 еўра | 3 095,19 |
| 1 латвійскі лат | 4 442,15 |
| 1 літоўскі літ | 896,44 |
| 1 чэшская крона | 117,22 |
| 1 польскі злоты | 855,70 |
| 1 расійскі рубель | 87,12 |
| 1 украінская грыўня | 425,88 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*
**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,7235 |
| 10 UAH | 48,7038 |
| 1000 BYR | 11,4540 |
| EUR | 35,5796 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.12.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ООО «Агенство Владимира Гревцова» УПН 10002407 Лицензия Минсвязи № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 до 02.05.2009*

*У сувязі са святамі наступны нумар газеты выйдзе 27 снежня.*

ISSN 1990 - 763X
07244>
9771990763008

Говорят под Новый год,
что ни пожелается
Все всегда произойдет.
Все всегда сбывается...



С Рождеством и Новым годом!

**Сбылось!!!**

**С 22 декабря «БПС-Банк» увеличивает процентные ставки по действующим и вновь привлекаемым вкладам в иностранной валюте**

**Срочный накопительный депозит с капитализацией в иностранной валюте**

| Срок привлечения | Процентная ставка (годовая) Доллары США, евро |
|---|---|
| 1 год | 8,5 |
| 2 года | 9,5 |
| 3 года | 10 |

- **дополнительные взносы** и капитализация процентов с возможностью их ежемесячного получения
- досрочное востребование средств с перерасчетом процентов **по льготной шкале**

**Срочный депозит в иностранной валюте «Динамичный»**

| Срок привлечения | Процентная ставка (годовая) Доллары США, евро |
|---|---|
| 1 год | 8,5 |
| 3 года | 9,75 |

- дополнительные взносы и **капитализация** процентов с возможностью их ежемесячного получения
- досрочное востребование средств с перерасчетом процентов **по льготной шкале**
- частичное востребование средств **без потери процентов**
- по истечении срока депозита **автоматическое переоформление** на следующий срок
- возможность открытия депозита на имя другого лица

**Обращайтесь в филиалы и отделения ОАО «БПС-Банк»**
Дополнительную информацию можно получить по телефону: (017) 289-46-06 или на сайте www.bpsb.by

БПС-БАНК

ОАО "БПС-Банк". УНП 100219673. Лицензия Национального банка Республики Беларусь №4 от 11.07.2007 года.

Прамая лінія

# Ільготы. Ці падтрымка «з адрасам»?

**На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць начальнік Упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Пятроўна СЯРГЕЕВА, начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Іван Пятровіч НАГІБІН, намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Аверкіеўна ЖЫЛЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алена Іванаўна ДУДЗІНСКАЯ, намеснік начальніка ўпраўлення аўтамабільнага транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый Юрый Віктаравіч КАРАВАЙКІН і кансультант упраўлення аўтамабільнага транспарту Мінтранса Алег Аляксандравіч БОЦІН.**



**(Працяг. Пачатак у нумары за 20 снежня.)**

***— У нас шматдзетная сям'я — шасцёра непаўналетніх дзяцей плюс двое бацькоў. Пры гэтым агульная з мужам зарплата складае 1 млн 150 тыс. рублёў. Ці зможам мы скарыстацца правам на адрасную сацыяльную дапамогу?***

*Алена Ільінічна Савіцкая, Слуцкі раён*

— Штомесячная адрасная сацыяльная дапамога прызначаецца ў выпадку, калі сярэднедушавы даход на кожнага члена сям'і за тры папярэднія перад зваротам месяцы не перавышае бюджэту пражытковага мінімуму, ці на сёння — 185 670 рублёў. Інакш кажучы, для сям'і з 8 чалавек планка такой патрэбы — 1 млн 493,3 тыс. рублёў. А зараз супастаўце гэта з вашым сукупным даходам і ў выпадку, калі ён меншы, — звяртайцеся ў аддзел ці ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

***— На якую падтрымку можа разлічваць маці-адзіночка, якая атрымлівае толькі дзіцячую дапамогу ў памеры 210 тысяч рублёў?***

*Анастасія, г. Мінск*

— У такім выпадку звяртайцеся ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства па адрасную сацыяльную дапамогу. Пры гэтым памер такой дапамогі складзе розніцу паміж бюджэтам пражытковага мінімуму і сярэднім даходам на кожнага члена сям'і за тры папярэднія месяцы. Скажам, у вашым канкрэтным выпадку сям'і з двух чалавек трэба ад 2 бюджэтаў пражытковага мінімуму (а гэта на сёння 371 340 рублёў) адняць суму адзінага даходу — дапамогі на дзяцей.

***— Мая адзінокая састарэлая цётка, якая пражывае ў Іванаўскім раёне на Брэстчыне, мае вельмі малую пенсію — усяго 180 тысяч. Ці ёсць ёй сэнс звяртацца па адрасную сацыяльную дапамогу?***

***І яшчэ пытанне — ці зможа цётка, у выпадку неабходнасці, разлічваць на пэўныя аднаразовыя сацыяльныя паслугі?***

*Вольга Іванаўна, Мінскі раён*

— Сэнс звяртацца ёсць, тым больш што цётка жыве адна, а гэта значыць, што па сутнасці ёй трэба толькі напісаць заяву — астатнія дакументы збяруць спецыялісты раённага аддзела па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Сапраўды, на сёння «планка патрэбы» складае 185 тыс. рублёў, адпаведна, сама адрасная дапламта ў дадзеным выпадку будзе каля 5 тысяч. Аднак нельга не заўважыць, што «планка патрэбы» адпавядае бюджэту пражытковага мінімуму, а ў сваю чаргу БПМ пераразлічваецца штоквартальна — у сувязі з ростам цэнаў. Што ж да аднаразовых сацыяльных паслуг, скажам, дапамогі з дробным рамонтам, то з гэтым пытаннем неабходна звяртацца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Іванаўскага раёна. Прычым зноў-такі, калі даход цёткі ніжэй за бюджэт пражытковага мінімуму, то ёй такія паслугі павінны аказвацца бясплатна.

***— Дачка, якая атрымлівае каля 400 тыс. рублёў, адна гадуе сына — 18-гадовага студэнта-завочніка, які пакуль не можа ўладкавацца на працу. Ці можа сям'я дачкі разлічваць на адрасную сацыяльную дапамогу?***

*Мая Міхайлаўна Каспяровіч, г. Мінск*

— Для прызначэння адраснай дапамогі неабходна, каб даход аднаго чалавека ў сям'і не перавышаў 185 670 рублёў, а даход сям'і з 2 чалавек — 371 340 рублёў. Словам, атрымліваецца, што права на адрасную падтрымку тут не будзе. Таму, каб палепшыць матэрыяльнае становішча сям'і вашай дачкі, трэба параіць адно — працаўладкавацца ўнуку. Прычым, калі з пошукам вакансіі ўзнікаюць праблемы, можна звярнуцца па дапамогу ў службу занятасці насельніцтва.

***— Атрымліваю 155 тыс. рублёў пенсіі. У сувязі з гэтым, ці магчыма звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу? І колькі часу такая дапамога будзе прызначацца?***

*Клаўдзія Іванаўна Калодка, Навагрудскі раён*

— Паколькі ваша пенсія ніжэйшая за бюджэт пражытковага мінімуму, звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу ў раённыя органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на самай справе можна. Прычым дапамога аднаразначна будзе прызначана на 6 месяцаў у год. А наконт астатняй часткі года павінна прымацца асобнае рашэнне — працягваць выплаты або не.

***— У нас трое дзяцей, прычым старэйшай дачцэ 21 год і яна студэнтка. Ці ўключаецца яна ў склад сям'і пры прызначэнні адраснай сацыяльнай дапамогі?***

*Ірына Вітальеўна Кураленя, г. Старыя Дарогі*

— Незалежна ад таго, дзе навучаецца старэйшая дачка, яна будзе лічыцца членам вашай сям'і, а яе стыпендыя — уключацца ў ваш сукупны даход. Прынамсі, калі дачка не мае ўласнай, асобнай сям'і.

***— Разам са мной зараз пражывае сын з нявесткай і маленькім дзіцем. Ці можа сям'я сына атрымліваць адрасную сацыяльную дапамогу? І ці зменіцца склад яго сям'і, калі сын пойдзе ў армію?***

*Леанарда Браніславаўна Чуро, Докшыцкі раён*

— Тут усё залежыць ад таго, які даход мае сям'я вашага сына, і ад таго — ведзяце вы з сынам сумесную гаспадарку ці не. Калі сумесная гаспадарка вядзецца, сукупны даход будзе лічыцца на чатырох чалавек, а калі сумесная гаспадарка не вядзецца — на трох. І, да слова, сам факт вядзення асобнай гаспадаркі пацвярджаецца або падзелам асабістых рахункаў, або спецыяльнай камісіяй на падставе абследавання матэрыяльна-бытавых умоў.

Пры гэтым калі сын пойдзе на тэрміновую службу ў армію, то ў склад сям'і ён уваходзіць не будзе.

***— Турбуюць з Докшыцкага раёна, завуць мяне Алена. 15 студзеня споўніцца роўна тры месяцы, як я знаходжуся на ўліку ў службе занятасці насельніцтва. Патлумачце, калі мне можна звяртацца па адрасную сацыяльную дапамогу?***

— Роўна праз тры месцы рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнай, інакш кажучы, адразу ж пасля 15 студзеня.

***— Ці можа разлічваць на адрасную дапамогу сям'я, дзе дзіця вучыцца на платным аддзяленні, аднак плату за навучанне ўносім не мы, а наш сваяк?***

*Ірына Анатольеўна, Лідскі раён*

— Увогуле навучанне на платным аддзяленні права на атрыманне адраснай сацыяльнай дапамогі пазбаўляе. Аднак калі вы зможаце прадставіць дакумент са сведчаннем таго, што аплату за навучанне ўносіць сваяк, мяркуем, пытанне вырашыцца станоўча.

***— Непакояць з Астравецкага раёна. Дазвольце ўдакладніць, якая зарплата ўлічваецца пры разліку даходу для адраснай сацыяльнай дапамогі — налічаная або «чыстая»? Ці ўваходзіць у сукупны даход дзіцячая дапамога? І ўвогуле, за якія месяцы трэба падаваць даведкі?***

— Падчас разліку даходу ўлічваецца менавіта налічаная зарплата. Пры гэтым у склад сукупнага даходу ў тым ліку ўключаецца і дзіцячая дапамога. Што ж да даведак, то збіраць іх трэба за тры папярэднія месяцы, інакш кажучы, пры звароце па адрасную сацыяльную дапамогу ў снежні — за лістапад, кастрычнік і верасень.

***— Ці ёсць якія-небудзь ільготы ў жонкі ваеннаслужачага, які загінуў пры выкананні службовага абавязку?***

*Аляксандра Мікалаеўна, г. Мінск*

— Жонкам загінулых пры выкананні службовага абавязку ваеннаслужачых, цяпер прадугледжваюцца павышэнне пенсій, падатковыя льготы, а таксама шэраг побытавых ільгот — скажам, на першачарговае атрыманне асобных паслуг.

***— Якія захаваліся льготы ў пенсіянераў — ветэранаў працы?***

*Ала Адамаўна Грыгарцэвіч, г. Мінск*

— У ветэранаў працы, якія не з'яўляюцца інвалідамі, ільгот амаль не засталося — за выключэннем права на забеспячэнне санаторна-курортнымі пуцёўкамі з частковай аплатай у залежнасці ад узроўню даходу, на атрыманне дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі зноў-такі ў залежнасці ад узроўню даходу і права на першачарговае атрыманне асобных паслуг.

***— Патлумачце, што будзе з тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі для інвалідаў III групы ў выніку дзіцячага цэрабральнага паралічу?***

*Міхаіл Іванавіч Смірноў, г. Мінск*

— Што датычыцца інвалідаў III групы, а таксама асобаў, якія маюць паводле заключэння медыкаў патрэбу ў тэхнічных сродках рэабілітацыі і пры гэтым не маюць групы, то ім можа выплачвацца аднаразовая сацыяльная дапамога. Але пры ўмове, што даход такіх грамадзян не перавышае 120 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

***— Мне ўжо больш за 70 гадоў, пры гэтым я маю статус малалетняга вязня і адначасова — інваліднасць II групы. Што будзе з маімі льготамі?***

*Ганна Цімафееўна Вінсарэвіч, г. Беразіно*

— Як у малалетняга вязня вайны, у вас захавалася толькі права на павышэнне да пенсіі, права на льготнае падаткаабкладанне і некаторыя перавагі пры бытавым абслугоўванні. А вось як у інваліда II групы пералік ільгот і гарантый большы. Па сутнасці, асноўныя льготы тут застаюцца — за выключэннем сезоннай 50-працэнтнай скідкі на праезд у міжгароднім аўтатранспарце, 50-працэнтнай скідкі пры аплаце за карыстанне тэлефонам і права на бясплатную ўстаноўку таго ж тэлефона.

***— Ці застаюцца якія-небудзь ільготы па артыкулу 19 Закона «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС»?***

*Васіль Рыгоравіч, г. Масты*

— Не. Прычым нельга не заўважыць, што згодна з гэтым артыкулам ільготы не дзейнічаюць ужо фактычна з 1995 года.

***— Ці захаваліся льготы па крэдытаванні на будаўніцтва жылля для інвалідаў I групы?***

*Ала Рыгораўна, г. Мінск*

— Прынамсі, можна заўважыць адно: ніякіх новаўвядзенняў на гэты конт цяперашні Закон «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях» не прадугледжвае.

***— Мы з жонкай — інваліды I і II групы. Зараз сказалі, што льготы па аплаце жыллёва-камунальных паслуг нібыта не будзе, паколькі мы маем дачку ў працаздольным узросце. Ці так гэта, бо дачка вось ужо 20 гадоў жыве зусім у іншым горадзе — Маладзечне?***

*Яўген Уладзіміравіч Лабецкі, Баранавічы (падчас «прамой лініі» паступіла некалькі аналагічных званкоў)*

— Ільгота будзе. Сапраўды, заканадаўства вызначае, што скідкі з кошту тэхабслугоўвання і камунальных паслуг прадастаўляюцца толькі інвалідам I і II груп, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, абавязаных утрымліваць іх па закону, пражываюць адны, разам з такімі ж інвалідамі I і II групы ці з непрацуючымі пенсіянерамі, што дасягнулі агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту.

Аднак тут варта звярнуць увагу на адзін нюанс. Вы з жонкай і ваша працаздольная дачка членамі адной сям'і не з'яўляюцца. Гэта дзве асобныя сям'і, якія жывуць у розных населеных пунктах і вядуць самастойныя гаспадаркі.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
**(Заканчэнне будзе.)**




*Здзіўленыя вадзіцелі і самі амаль спыняліся на Кастрычніцкай плошчы: не дзіва — у ролі «даішнікаў» былі сапраўдныя Дзед Мароз і Снягурка. Такая незвычайная пераднавагодняя акцыя была праведзена супрацоўнікамі гарадскога ДАІ ў цэнтры Мінска. Кожны са спыненых вадзіцеляў атрымаў шмат добрых «аўтамабільных» пажаданняў і ў адказ на гэта спяваў песні, чытаў вершы або танцаваў.*

**ВНИМАНИЮ ВЛАДЕЛЬЦЕВ АКЦИЙ ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»**

**ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» сообщает, что 28 декабря 2007 г.**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ**

**акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в заочной форме путем письменного опроса с повесткой дня:**

- *об авансовом распределении прибыли ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».*

Бюллетени для заочного голосования лица, имеющие право на участие в Общем Собрании акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», могут получить, заполнить и предоставить по месту нахождения головного офиса ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» и его филиалов по следующим адресам:

***г. Минск, ул. Мельникайте, 8;***
***г. Минск, ул. Энгельса, 30;***
***г. Витебск, ул. Чапаева, 16;***
***г. Гомель, ул. Головацкого, 19;***
***г. Гродно, бульвар Ленинского комсомола, 7а;***
***г. Могилев, пер. 2-й Крутой, 3а.***

*Срок окончания приема заполненных бюллетеней 26 декабря 2007 г.*

Информация по вопросам повестки дня предоставляется по указанным адресам лицам, имеющим право на участие в собрании, при предъявлении ими документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

***Телефон для справок: т/ф (8 017) 209 41 85.***

**Наблюдательный Совет ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»**

## У свеце

### ПАРТЫЗАН ПЕРАМОГ ЛАТВІЮ

**Былы савецкі партызан, палкоўнік у адстаўцы Васіль Кананаў, асуджаны ў Латвіі за «ваенныя злачынствы», выйграў справу супраць рэспублікі ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека.**

Кананаў узначальваў у гады Вялікай Айчыннай партызанскі атрад, які змагаўся з фашыстамі. У 1998 годзе ён быў арыштаваны па абвінавачванні ў дачыненні да карнай экспедыцыі 1944 года, у ходзе якой былі забітыя мірныя жыхары. Справу Кананава некалькі разоў пераглядалі, а ў 2000 годзе рыжскі акружны суд прызнаў яго вінаватым і прыгаварыў да 6 гадоў турмы. У 2004 годзе Вярхоўны суд краіны пацвердзіў віну партызана, але Кананаў пайшоў далей і ў рэшце рэшт атрымаў перамогу ў Еўрапейскім судзе.

### КРАДУЦЬ...

**З музея мастацтваў у бразільскім Сан-Паўла пазаўчора зладзеі знеслі карціну Пабла Пікасо «Партрэт Сюзаны Блох» і «Зборшчыка кавы» Парцінары. Рабаванне заняло ўсяго тры хвіліны, а вось кошт страчаных твораў ацэньваецца прыкладна ў 100 мільёнаў долараў.**

У Паўладарскай вобласці Казахстана паліцыя ўзбудзіла крымінальную справу на падставе факта крадзяжу чыгуначных рэек непадалёк ад расійскай мяжы. Там з 2004 па 2007 год былі дэманціраваныя і скрадзеныя больш за 62 кіламетры рэек і шпалаў, дзяржаве быў нанесены ўрон каля 12,4 млн долараў. А ў Адэсе з цэнтральнага парку культуры і адпачынку імя Тараса Шаўчэнкі зніклі тры старажытныя гарматы. Зброя мела вялікую гістарычную каштоўнасць — гэта былі гарматы вагай па 4 тоны кожная, якія ў час руска-турэцкай вайны стаялі на берагавых батарэях Адэсы. Кошт адной ацэньваецца ў суму каля 20 тысяч долараў.

### У ЕЎРОПЕ ДЗЯЦЕЙ ВЫХОЎВАЮЦЬ БЕЗ РЭМЕНЯ

**Іспанскім бацькам у заканадаўчым парадку забаранілі шлёпаць сваіх дзяцей.**

Раней закон дазваляў «разумна і ўмерана выпраўляць» непаслухмяных нашчадкаў, аднак зараз у Грамадзянскі кодэкс былі ўнесены змяненні, якія абароняць дзіця ад фізічнага і псіхалагічнага ціску. Забарону на цялесныя пакаранні дзяцей у школах і дома ўвялі ўжо 16 краін — членаў ЕС.

## СВЕДЕНИЯ об объекте республиканской собственности, подлежащем приватизации

*Госкомимущество РБ УНП 100745627*

| | |
|---|---|
| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское хлебоприемное унитарное предприятие «Буда-Кошелевское хлебоприемное предприятие» РХУП «Буда-Кошелевское ХПП» Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь |
| Адрес | 247350, Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Комсомольская, 5 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Хранение зерна, реализация зерна, реализация муки |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2007 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 |
| Численность работающих, чел. | 40 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемая величина уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 931 308 400 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 985 157 207 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 4,291 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, млн. рублей | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 8 000 000 |
| Задолженность кредиторская | 274 792 178 |
| Задолженность дебиторская | 169 185 281 |

## СВЕДЕНИЯ об объекте республиканской собственности, подлежащем приватизации

*Госкомимущество РБ УНП 100745627*

| | |
|---|---|
| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское унитарное сельскохозяйственное производственное предприятие «Оранчицкая птицефабрика» РУСПП «Оранчицкая птицефабрика» Министерство сельского хозяйства и продовольствия |
| Адрес | 225149, Брестская область, Пружанский район, п/о Линово, д. Оранчицы, ул. Трудовая, 125 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Производство яиц, производство мяса и мясопродуктов, розничная торговля в неспециализированных магазинах преимущественно пищевыми продуктами, включая напитки, и табачными изделиями |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2007 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Брестский областной территориальный фонд государственного имущества 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11 |
| Численность работающих, чел. | 151 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемая величина уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 5 457 865 600 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 8 207 384 966 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 468,0695 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, млн. рублей | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 317 568 776 |
| Задолженность кредиторская | 2 194 309 985 |
| Задолженность дебиторская | 936 571 177 |

## СВЕДЕНИЯ об объекте республиканской собственности, подлежащем приватизации

*Госкомимущество РБ УНП 100745627*

| | |
|---|---|
| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Республиканское научно-производственное унитарное предприятие «Конструкторское бюро системного программирования» и республиканское дочернее унитарное предприятие «Маркер» Государственный военно-промышленный комитет Республики Беларусь |
| Адрес | 246012, г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 135 |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Разработка программного обеспечения и консультирование в этой области; исследования и разработки в области естественных наук; деятельность, связанная с продукцией военного назначения |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2007 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3 |
| Численность работающих, чел. | 214 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемая величина уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 8 799 194 800 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 10 636 746 252 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 3,0047 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, млн. рублей | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 797 721 211 |
| Задолженность кредиторская | 1 709 976 395 |
| Задолженность дебиторская | 103 423 844 |

## СВЕДЕНИЯ об объекте республиканской собственности, подлежащем приватизации

*Госкомимущество РБ УНП 100745627*

| | |
|---|---|
| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | Унитарное республиканское сельскохозяйственное предприятие «Совхоз-комбинат «Светлый» УРСП «Совхоз-комбинат «Светлый» Министерство сельского хозяйства и продовольствия |
| Адрес | 213550, Могилевская область, Чериковский район, п/о Веремейки, п. Житнев |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | Выращивание и откорм свиней, а также их промышленная переработка; производство и реализация сельскохозяйственной продукции и иная предпринимательская деятельность с правом оптовой и розничной торговли |
| Положение на рынке | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | 4 квартал 2007 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | Могилевский областной территориальный фонд государственного имущества 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62 |
| Численность работающих, чел. | 495 |
| Сроки предъявления претензий | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемая величина уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | 40 679 003 200 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | 44 994 629 869 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | 4248,89 |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | нет |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, млн. рублей | нет |
| Финансовое состояние объекта, рублей: Балансовая прибыль | 683 519 822 |
| Задолженность кредиторская | 7 041 577 350 |
| Задолженность дебиторская | 670 165 475 |

# ПЕРАХОД НА МЯСЦОВЫЯ ВІДЫ ПАЛІВА ПАВЫСІЦЬ ЭНЕРГЕТЫЧНУЮ БЯСПЕКУ ДЗЯРЖАВЫ



### ВІЗІТНАЯ КАРТКА ПРАДПРЫЕМСТВА

***Жодзінская ЦЭЦ уведзена ў эксплуатацыю ў 1951 годзе адначасова з высакавольтнай лініяй 110 кВ сувязі з Мінскім энергавузлом. У 1981—1987 гадах станцыя прайшла карэнную рэканструкцыю з пераводам на газ/мазут замест фрэзернага торфу, дэмантажом імпартных турбін і арганізацыяй цеплафікацыйнага адбору на турбінах ВК-25-1 з пераводам іх у рэжым пагоршанага вакууму. Уведзены два катлы КВГМ-100. Электрычная магутнасць станцыі — 54 МВт, цеплавая — 434 Гкал/гадзіну.***

***ЦЭЦ забяспечвае электра- і цеплазабеспячэнне буйнога прамыслова вузла ў горадзе Жодзіне, у тым ліку завода па вырабе велікагрузных аўтамабіляў рэспубліканскага значэння — БелАЗа.***

***У складзе станцыі тры буйныя прамыслова-ацяпляльныя кацельні ў горадзе Барысаве агульнай цеплавой магутнасцю 677 Гкал/гадзіну.***

### АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ РАЗВІЦЦЯ ЖОДЗІНСКАЙ ЦЭЦ

***Аляксандр ЗАКРЭЎСКІ, дырэктар Жодзінскай ЦЭЦ:***

— Як вядома, у нашай краіне распрацавана дзяржаўная праграма па абнаўленні энергетычных фондаў і павелічэнні спальвання мясцовых відаў паліва ў балансе энергетыкі Беларусі.

У сувязі з гэтым напрамкам на Жодзінскай ЦЭЦ заканчваецца распрацоўка праекта па ўводзе ў эксплуатацыю ў 2008 годзе паравога катла магутнасцю каля 60 тон у гадзіну і рабочым ціскам 100 атмасфер. Кацёл будзе працаваць на мясцовых відах паліва, асноўным жа яго палівам запланавана зрабіць тарфяныя брыкеты. Тэхналагічныя магчымасці катла дазволяць спальваць драўляныя трэскі і фрэзерны торф. Дадзенаму праекту на прадпрыемстве надаецца найвышэйшая ўвага, бо агучаная праграма знаходзіцца на кантролі Савета Міністраў Беларусі і галіновага міністэрства.

У перспектыве новы кацёл дазволіць замяніць на мясцовыя віды паліва прыкладна 4—5 тысяч кубаметраў прыроднага газу ў гадзіну. Новае абсталяванне дазволіць спальваць каля 57 тысяч тон умоўнага паліва ў год. У выніку менавіта на такі памер паліва наша эканоміка будзе менш залежаць ад паставак расійскага газу. Мне здаецца, што гэты праект паспрыяе больш эфектыўна выкарыстоўваць мясцовыя віды паліва для вырабу электраэнергіі. Трэба заўважыць, што мясцовыя віды паліва абыходзяцца нашай краіне значна танней за прыродны газ, які набываецца за мяжой і працягвае толькі даражэць.

— На нашым прадпрыемстве працуе шмат сапраўды класных спецыялістаў, якія заслугоўваюць павагі.

Асобна хачу адзначыць начальніка змены Жодзінскай ЦЭЦ Уладзіміра Краўчанку, які больш за 30 гадоў бездакорна адпрацаваў на нашым прадпрыемстве, якому можна давяраць задачу любой складанасці. Сёлета Уладзіміру Уладзіміравічу было прысвоена ганаровае званне аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга» «Ганаровы работнік беларускай энергасістэмы». Таксама за шматгадовую працу і дасягненне высокіх паказчыкаў аб'яўлена падзяка аб'яднання «Белэнерга» работніку каталатурбіннага цэха Сяргею Валасачу.

## Віншаванне калектыву Жодзінскай ЦЭЦ ад кіраўніка прадпрыемства:



***— Паважаныя энергетыкі і ветэраны Жодзінскай ЦЭЦ! Ад імя адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта нашага прадпрыемства віншую вас з нашым прафесійным святам — Днём энергетыка, які адзначаецца 22 снежня. У гэты асенне-зімовы перыяд энергетыкі працуюць з поўнай нагрузкай, такім чынам забяспечваючы нашых спажыўцоў святлом і цяплом. Галоўная задача энергетыкаў — надзейна і бесперабойна забяспечваць цеплавой і электрычнай энергіяй жыхароў краіны. У гэты святочны дзень жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў у працы, шчасця вам і вашым сем'ям, міру і дабра.***

**З павагай дырэктар Жодзінскай ЦЭЦ Аляксандр ЗАКРЭЎСКІ.**

### У ПРАДПРЫЕМСТВА — МОЦНЫ САЦЫЯЛЬНЫ ПАКЕТ

***Намеснік дырэктара Жодзінскай ЦЭЦ Іван ДРОЗД:***

— Спецыялісты прадпрыемства атрымліваюць дастойныя заробкі ў маштабах горада Жодзіна. Больш за тое, работнікаў Жодзінскай ЦЭЦ абараняе моцны калектыўны дагавор, які прадугледжвае цэлы сацыяльны пакет. У прадпрыемства ёсць тры інтэрнаты для ўласных работнікаў. Сёлета ў адным інтэрнаце сямейнага тыпу была зроблена рэканструкцыя. Цяпер там цудоўныя ўмовы для пражывання, бо пакоі былі мадэрнізаваны ў аднапакаёвыя кватэры.

За два кіламетры ад Жодзіна размяшчаецца ўласны піянерскі лагер, дзе ў летні перыяд могуць адпачываць дзеці работнікаў як нашага прадпрыемства, так і энергасістэмы ўвогуле. На прадпрыемстве працуе сталовая і дзейнічае сучасны пункт аховы здароўя, дзе днямі быў завершаны капітальны рамонт. Шмат увагі надаецца пенсіянерам-энергетыкам, якім кіраўніцтва Жодзінскай ЦЭЦ дапамагае нават у фінансавым плане. Сёлета сярод работнікаў ЦЭЦ быў сфарміраваны жыллёва-будаўнічы кааператыў. У хуткім часе запланавана пабудаваць дом на 60 кватэр для работнікаў прадпрыемства.

**Матэрыял падрыхтавалі Сяргей КУРКАЧ і Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**
***Здымкі — з архіва прадпрыемства.***
*УНП 100071593*

# У НАВАГОДНЮЮ НОЧ БУДЗЕ ЦЁПЛА!

**Гэта прагноз ад УП «Мінсккамунцепласетка», які датычыцца тэмпературы ў кватэрах мінчан**

**Якім будзе надвор'е на Новы год? Гэта пытанне цікавіць многіх з нас. Але што б ні прагназавалі сіноптыкі — галоўнае, каб цяпло і ўтульнасць панавалі ў нашых душах... і безумоўна, у кватэрах. Калі душэўны камфорт залежыць толькі ад нас саміх, то вось забеспячэнне камфортных тэмператур у жылых памяшканнях цалкам бяруць на сябе энергетыкі.**

У сталіцы амаль палову жылых кватэр цяплом і гарачай вадой забяспечвае ўнітарнае прадпрыемства «Мінсккамунцепласетка». Сёння на балансе прадпрыемства знаходзяцца 32 кацельні магутнасцю 486,5 Гкал/г і адна транспартабельная кацельня магутнасцю 1,6 МВт, 193 цэнтральныя цеплавыя пункты і квартальныя пункты ўліку цяпла, транспартабельны блочны цеплавы пункт магутнасцю 5 Гкал/г і каля 600 км цеплассетак.



Сітуацыя, якая склалася ў апошнія гады з энергарэсурсамі, дадала акцэнтаў у работу прадпрыемства.

— Сёння мы не толькі абавязаны надзейна забяспечыць цяплом нашых спажыўцоў, — гаворыць **дырэктар УП «Мінсккамунцепласетка» Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ**, — але і зрабіць гэта з максімальнай эканоміяй. Асноўная доля затрат на вытворчасць цеплавой энергіі — гэта паліўна-энергетычныя рэсурсы. У нашым выпадку — газ, які экспартуецца з-за мяжы. І хоць прадпрыемства задзейнічана ў рэспубліканскай праграме па выкарыстанні мясцовых відаў паліва, іх укараненне абмежавана ўмовамі вялікага горада. Таму мы стараемся знайсці ў першую чаргу спосабы больш эканамічнага выкарыстання менавіта газу. Гэта і рэканструкцыя ЦЦП і кацельняў, і ўкараненне аўтаматызаванай сістэмы кіравання, і ўвод кагенерацыйных установак, што дае магчымасць знізіць расход паліўна-энергетычных рэсурсаў на 10—12 працэнтаў.

З другога боку, мы пільную ўвагу надаем зніжэнню страт цеплаэнергіі падчас яе транспарціроўкі, а страты гэтыя, прызнаемі, могуць даходзіць да 25 працэнтаў. Выкарыстанне папярэдне ізаляваных труб дае магчымасць знізіць гэты паказчык у 5—10 разоў. Калі ж гэта гібкія папярэдне ізаляваныя трубы «Ізапрафлекс» і «Касафлекс», якія не паддаюцца каразіі і могуць эксплуатавацца без замены больш за 50 гадоў, эканамічны эфект узрастае ўдвая. За 11 месяцаў гэтага года спецыялістамі УП «Мінсккамунцепласетка» было заменена 33,5 км труб, 24 км з іх — на папярэдне ізаляваныя. Дарэчы, павелічэнне ў энергасістэме Мінска за апошнія гады долі цеплатрас з папярэдне ізаляванымі трубамі не толькі зніжае страты цеплаэнергіі, але і павышае надзейнасць, а значыць зніжае затраты на рамонтныя работы. Так, сёлета ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года адбылося на



48 пашкоджанняў менш, і гэта пры пастаянным павелічэнні працягласці цеплатрас. (Толькі ліквідацыйныя работы па адным пашкоджанні, без уліку страт і наступстваў, абыходзіцца каля 2 млн рублёў.)

Вялікую ролю ў рацыянальным размеркаванні і расходаванні цеплавой энергіі адыгрываюць мерапрыемствы, якія праводзяцца сумесна з арганізацыямі ЖКГ — устаноўка сістэм рэгулявання падачы цяпла і прыбораў яго ўліку, а таксама цеплавая рэабілітацыя будынкаў, якая зніжае цеплаастраты да 45 працэнтаў.

Што ж датычыцца выкарыстання мясцовых відаў паліва (МВП) у цеплазабеспячэнні сталіцы, «Мінсккамунцепласетка» працуе і ў гэтым накірунку. Так, у мінулым годзе была пераведзена на МВП кацельня вытворчай базы па вул. Гая, 91, магутнасцю 12,5 к Вт. Зараз на завяршальным этапе знаходзяцца праектныя работы па ўстаноўцы катла на МВП на кацельні пас. Баравая, разглядаецца эфектыўнасць аналагічнага праекта для кацельні пас. Сокал. Укараняюцца і новыя, нетрадыцыйныя пакуль для нашай энергетыкі цеплакрыніцы. У наступным годзе запланавана ўстаноўка сонечных водападагравальных сістэм на двух будынках горада.

**Дзякуючы ўкараненню комплексу мерапрыемстваў па энергазберажэнню сёлета прадпрыемствам было выкарыстана на 4515 т у.п. менш, чым за той жа перыяд мінулага года, а паказчык па энергазберажэнні перавысіў 15 працэнтаў.**

І такая сур'ёзная эканомія, ніяк не паўплывае на стабільна камфортную тэмпературу ў кватэрах мінчан, якую УП «Мінсккамунцепласетка» абавязкова забяспечыць і ў навагоднюю ноч нягледзячы на сюрпрызы капрызнага надвор'я.

**Таццяна ЛЯКОВІЧ.**

## ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ І СЯБРЫ!

**Камунальнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства па эксплуатацыі і рамонце камунальных цеплавых сетак і кацельняў**

**УП «Мінсккамунцепласетка»**

**віншуе вас і вашы калектывы з прафесійным святам —**

**ДНЁМ ЭНЕРГЕТЫКА!**

**Прыміце шчырыя пажаданні пасляховай плённай дзейнасці, невычарпальнай энергіі, новых творчых поспехаў, стабільнасці, шчасця і дабрабыту вам і вашым сем'ям.**

**Выказваем вам сардэчную падзяку за дзейснае супрацоўніцтва з нашай арганізацыяй, ваш вопыт, высокі ўзровень прафесійнага майстэрства, дзелавую рэпутацыю**

***З павагай, калектыў УП «Мінсккамунцепласетка».***

**УП «МІНСККАМУНЦЕПЛАСЕТКА»**
220049, г. Мінск, вул. Валгаградская, 12.
тэл/факс: 267-33-11
**http//www.mkts.by**
*Ліц. № 02300/0213578 ад 20.02.04, выдадзена МНЗ РБ.*
*УНП 100185328*

Рэпартаж з колаў

# «ЗВЯЗДА»? ГЭТА ТОЕ, ШТО ТРЭБА ЧЫТАЦЬ!

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 21 снежня.)***

...На галоўнай пошце Віцебска нашы прэзентацыі праходзілі ўжо не раз. І, здаецца, у кожны — прыходзілі на іх, так званыя, дзяды. Прычым не проста дзяды, а нашы... Іван Іванавіч Тышко (ён жа проста Янка) па «Звяздзе» некалі вучыўся чытаць (ёй былі паклеены сцены ў бацькоўскай хаце). Стаж падпіскі на газету ў яго — 57 гадоў. Усё жыццё, як прызнаецца, чытаў «Звязду» Іван Дзмітрыевіч Башак. Яму, дарэчы, восемдзесят. І нават з вялікім хвастом. Што... «не ўзрост яшчэ», як кажа, бо бацькі яго жылі да ста. «Родную газету на роднай мове» пастаянна выпісвае і Мікалай Якаўлевіч Карповіч. Не маглі не спадзявацца на сустрэчу з Уладзімірам Мікалаевічам Масалковым і многімі іншымі...

Не ўсе, на жаль, прыйшлі. Але ж размова атрымалася. Прычым досыць нечаканай: да прэзентацыі газеты з лёгкай рукі віцебскіх паштавікоў далучыліся старшакласнікі адной з бліжэйшых школ. Уважліва слухалі, само сабой — разумелі, а ўжо як ахвотна адказвалі на пытанні! На чым друкавалася «Звязда» ў гады Вялікай Айчыннай, калі не хапала газетнай паперы? Чым узнагароджана? Куды ходзіць цягнік, названы ў гонар газеты? Хто з беларускіх класікаў з ёй супрацоўнічаў? На якой плошчы помнік рэдактару газеты Герою Савецкага Саюза Уладзіміру Амельянюку?..

Па сакрэту прызнаемся: у Віцебску мы нават... спявалі. Бо прагаварыліся, што у дзяцінстве наш фотакарэспандэнт Марына Бегункова выступала на Славянскім базары. «А без базару? — запатрабавалі госці. Што было рабіць?.. У зале загучала «Купалінка». Прычым, спявалі яе ўсе.

Да песень, да размоў (па-беларуску ж!) прыслухоўваліся кліенты пошты, асобныя падыходзілі, каб узяць на ўспамін наш каляндар з прыгожым Мірскім замкам, а то і падпісацца...

Шкада ў «экіпажы» на гэты раз не было Яўгена Пясецкага. Па дарозе ў Дуброўна ён абавязкова б нешта напісаў, бо ў вершы просіцца многае, пачынаючы з самае пявучае назвы. Прыгожы гарадок! І такія ж людзі. Сярод іх мы, зразумела ж, сустрэлі сваіх прыхільнікаў — начальніка вузла паштовай сувязі Леаніда Іванавіча Ханякова, «спрадвечную» падпісчыцу Зінаіду Рыгораўну Пятроўскую. Да выхаду на пенсію яна працавала ў мясцовай спецшколе-інтэрнаце, выкладала біялогію, выгадавала з мужам двух сыноў. Адзін, расказвала, у Мінску жыве. Ён і па звяздоўскі прыз прыязджаў.

Так-так, шанцавала Зінаідзе Рыгораўне. Адзін раз выйграла прыстасаванне для падводнай лоўлі рыбы.





Другі — электрапрас. І па сёння, расказвала, карыстаецца — добра служыць. А ўжо газета...

— І сама чытаю ад радка да радка, і муж мой. Усё патрэбнае — пра здароўе, пра сад-агарод, пра гаспадарку. І для душы шмат што ёсць, — гаварыла Зінаіда Рыгораўна.

Дзякавала газету за блізкасць да людзей, за разуменне іх праблем, за імкненне дапамагчы. У іх вось аптэчнага кіёска паблізу няма (ці ж справа хвораму за чатыры кіламетры па лекі хадзіць?), за тэлефон ля дома не заплаціш...

— Пачакаю яшчэ, можа на месцы гэтыя праблемы вырашым, а не — далібог напішу.

...Абяцаў напісаць нам і спадар Кабачэўскі з Оршы (**на здымку**). Праўда, з іншай нагоды. «Гумарылі» мы там, расказвалі «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў «Звязды». Васіль Дзянісавіч гаварыў, што яму таксама ёсць чым падзяліцца — напісаць толькі трэба, хай людзі пасмяюцца...

Але ж на сустрэчу ён завітаў не для гэтага. Хацеў сказаць (і сказаў!), што выпісвае «Звязду» з 1974 года і найперш — з-за мовы. А потым:

— У людзей цяпер няма магчымасці выпісваць па сем газет, — гаварыў ён. — Трэба, каб пра ўсё пісалі ў адной. Коратка, талкова. «Звяздзе» гэта ўдаецца: і пра палітыку тут, і пра рыбалку, і пра гісторыю нашу, і пра гарод... А вось чаго не хапае, дык гэта артыкулаў пра сапраўдных патрыётаў. Не тых, якія з'ехалі за мяжу... Тых, якія жывуць і працуюць тут, **на** гэтай зямлі і **дзеля** гэтай зямлі, **дзеля** народа.

Падставай для сур'ёзных размоў стала яшчэ адно выказванне Васіля Дзянісавіча:

— Вось у чыноўнікаў цяпер турбота, колькі пастаўлена лічыльнікаў вады і цяпла? Трэба, маўляў, лічыць, эканоміць... А вы спытайце, колькі чалавек, колькі дэпутатаў выпісала газету «Звязда»? Колькі народу думае на роднай мове, жыве свядома, па-беларуску? Ім жа не трэба казаць, каб эканомілі, каб гаспадарамі былі. Гэта ў крыві ўсё. І абудзіцца, калі вернецца да людзей мова.

Разам з аршанцамі, што прыйшлі на дзень падпісчыка «Звязды», мы ўзгадалі нашы традыцыі, нашы беларускія прымаўкі, песні, расказалі пра гісторыю газеты, правялі віктарыну, пакінулі што-кольвечы з дробных прызоў. І, хацелася б верыць, цёплы ўспамін, які (а раптам?) некага яшчэ далучыць да нашых падпісчыкаў.

...Не блізкі свет — з Мінска ў Шуміліна, адтуль — у Гарадок, потым Віцебск, Дуброўна, Оршу... Каля тысячы кіламетраў... «А толку?» — «павісла ў паветры», калі вярнуліся ў Мінск. «Каб зняць», каб сказаць (сабе), што ўсё было не так ужо і марна, будзем пералічваць далей. Нупа-першае, мы пазнаёміліся, пагаварылі з нашымі чытачамі, сабралі іх прапановы па паляпшэнні газеты, па другое — уручылі сумленна выйграны суперпрыз Яўгеніі Максімаўне Турковай (калі ласка, прабачце за ўчарашнюю памылку ў прозвішчы! — **Аўт.**), па-трэцяе, не адной сотні людзей па магчымасці цікава расказалі, што такое «Звязда» — учарашняя, сённяшняя і заўтрашняя, пагаварылі з нашымі, так бы мовіць, дзелавымі партнёрамі паштавікамі.

— Ёсць людзі, якія пастаянна, дзесяцігоддзямі, чытаюць «Звязду», — гаварыла інструктар па падпісцы Шумілінскага РВПС Таццяна Анатольеўна Пашкоўская. — Узяць хоць бы тую ж Асташонак Рэгіну Пятроўну, Казакову Таццяну Іванаўну, Палякову Тамару Мікалаеўну, нашу былую начальніцу Каралёву Тамару Сцяпанаўну... А ёсць тыя, хто першы раз выбірае. Дзе мы прапануем, а недзе людзі і самі...

Мо пачуўшы па тэлебачанні кароткае «Родная газета на роднай мове»? Мо купіўшы колькі нумароў «Звязды» ў кіёску? Мо прыслухаўшыся да парад нашых падпісчыкаў, альбо і нашых, падчас прэзентацый?..

У любым выпадку хочацца верыць, што і для старых, і для новых падпісчыкаў «Звязда» — гэта надоўга і гэта тое, што трэба чытаць. Бо...

Па вачах бачылі, не ўсё яшчэ страчана — жыве наша мова! І хочацца людзям, каб гучала яна, каб жыла далей, а вось, што зрабіць для гэтага?

Падказваем: самае простае — выпісваць беларускую газету, чытаць. І жыць, як вучылі бацькі і дзяды. Гэта значыць, годна, па-людску, у гармоніі з самім сабой.

**Валянціна ДОЎНАР,**
**Сяргей ПРОТАС,**
**Марына БЕГУНКОВА (фота).**


## ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ
МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў
СВАЯ СПРАВА — бізнэс, эканоміка, фінансы
Наш культурны асяродак ЖЫВАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! тавары паслугі цэны
КРАІНА ЗДАРОЎЯ

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8800 рублёў на месяц<br>26400 рублёў на квартал<br>52800 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8300 рублёў на месяц<br>24900 рублёў на квартал<br>49800 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 14000 рублёў на месяц<br>42000 рублёў на квартал<br>84000 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12800 рублёў на месяц<br>38400 рублёў на квартал<br>76800 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 7460 рублёў на месяц<br>26400 рублёў на квартал<br>44760 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 6990 рублёў на месяц<br>20970 рублёў на квартал<br>41940 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 9938 рублёў на месяц<br>29814 рублёў на квартал<br>59628 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 9431 рубель на месяц<br>28293 рублі на квартал<br>56586 рублёў на паўгоддзе |



## ПРЕДЛОЖЕНИЕ
### о покупке крупного пакета акций

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение покупателя акций | Компания: **Energy Systems Holding group ApS.** местонахождение: c/o CPH CONSULTING, lergravsvej 53, 2300, Copenhagen, Denmark. |
| Полное наименование и местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество (ОАО) «Мегасити», местонахождение: 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6-2е, тел. 210 19 34. |
| Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции | 500 (Пятьсот) белорусских рублей за одну акцию. |
| Сроки, форма и порядок оплаты акций | Предоплата, в течение 3 дней с момента подписания договора купли-продажи, по безналичному расчету. |
| Адрес, по которому будут заключаться договора купли-продажи акций | Город Минск, ул. Володько, 6-10, офис профессионального участника рынка ценных бумаг ООО «Каскад-93-Инвест». Тел. 298 57 68 |
| Дата начала и окончания покупки акций | С 22 декабря 2007 г. по 15 января 2008 г. Время с 10.00 до 15.00. |

*Предложение согласовано Главным управлением по ценным бумагам при Министерстве финансов Республики Беларусь по г. Минску.*


Забытае? Новае? Вечнае!

# НАДМАГІЛЬНЫ КРЫЖ: ШТО З ІМ РАБІЦЬ?

***«Хутка споўніцца год пасля смерці мужа. Трэба ставіць помнік, а што рабіць з крыжам, які да гэтага часу стаіць на магіле?» — пытаецца Таццяна К. з г. Слонім.***

Гэта пытанне болем адгукнулася ў нашых сэрцах, таму што якраз улетку мы наводзілі парадак на Грабёнскіх могілках, што ў Чэрвеньскім раёне. Былі там на працягу трох месяцаў і кожны раз сутыкаліся з непаразуменнем, якое не проста кідалася ў вочы, а брала за жывое. Каля ўваходу на могілкі ляжала вялікая гара смецця, сярод якога можна было ўбачыць шмат драўляных надмагільных крыжоў. Душа балела з-за нашай бездапаможнасці і неахайнасці, а яшчэ больш — з-за няведання адвечных традыцый і адсутнасці культуры падтрымання парадку на могілках.

Зразумела, што ў некаторых выпадках мы аказаліся міжвольнымі заложнікамі нашага сацыякультурнага становішча і вымушаны адначасова сядзець на дзвюх табурэтках, а дакладней — вісець паміж імі.

Сучаснае пахаванне нябожчыка заканчваецца тым, што на магіле ставіцца драўляны крыж. Сёння ён (каталіцкі або праваслаўны) з'яўляецца толькі часовым знакам вечнага прытулку хрысціянскага верніка. Праз год людзі ўзводзяць над магіламі памерлых суродзічаў гранітныя ці мармуровыя помнікі, на якіх дзе-небудзь у куточку выгравіраваны невялікі крыжык.

А што ў такім разе рабіць з тым часовым драўляным крыжам? Зноў, у каторы ўжо раз, заўважым, што ўсе мы аказаліся заложнікамі паралельнага суіснавання дзвюх традыцый: рэлігійнай і свецкай. Гэты дыялог культуры — даніна часу, і ад яго нікуды не схаваешся. Ён жорстка сутыкае ідэалагічныя, філасофскія, эстэтычныя і маральныя асновы гэтых традыцый і патрабуе пошуку нейкага выйсця. Хоць часцей за ўсё адбываецца элементарнае раздваенне формы і зместу, прычым, як правіла, форма застаецца традыцыйнай, а вось змест абнаўляецца, таму такое штучнае збліжэнне і выклікае пярэчанні і непаразуменні. Нашы сённяшнія нявесты ідуць пад вянец цяжарнымі, але на галаву мацуюць вянок — сімвал цнатлівасці. Па традыцыі побач з маладымі на працягу ўсяго вяселля знаходзяцца шафер і шаферка, якія аказваюцца... сямейнай парай. Тая ж сямейная пара потым будзе хрысціць іх дзяцей. Колькасць прыкладаў можа быць вялікай.

У рэчышчы праблемы суіснавання традыцыі і навацыі аказаліся і могілкі. Калі ў мінулыя часы на магіле ставілі крыж і абнаўляць яго было нельга, то сёння надмагільны крыж перажывае некалькі стадый свайго існавання. Спачатку ён узвышаецца над магілай, «замыкае» кампазіцыю сфарміраванай зоны смерці, з'яўляецца апазнавальным знакам канфесійнай прыналежнасці нябожчыка. Праз год на магіле паставяць свецкі знак — помнік. А далейшая гісторыя крыжа раздвойваецца і можа пайсці зусім рознымі шляхамі. Адзін варыянт — перад тым як узвесці над магілай гранітны помнік-комплекс (у вельмі шырокім дыяпазоне варыянтаў увасаблення), у зямлі робяць паглыбленне на 20—30 см і кладуць туды драўляны крыж, над якім будзе ўзвышацца помнік. Другі варыянт — пасля таго, як будзе пастаўлены помнік, крыж пакладуць збоку ад магілы ці ў галаве, і ён будзе знаходзіцца там яшчэ на працягу некалькіх гадоў. Нарэшце, праз некаторы час крыж згубіць сваё аблічча і яго выкінуць на сметнік як звычайную побытавую рэч, якая адслужыла свой век.

У нашай традыцыі існаваў звычай: двойчы (а ў некаторых месцах і больш) на год трэба было ачысціць зямлю ад усялякай старызны. Таму на Масленіцу і на Купалле хлопцы збіралі стаптаныя лапці, паламаныя кашы, струхлявелыя бароны і спальвалі на вогнішчы. Таму будзе значна лепш, калі перад Радаўніцай усе непатрэбныя крыжы збяруць у адно месца і спаляць. Лепш так, чым назіраць за тым, як яны валяюцца на гары смецця.

Аднак ёсць яшчэ адзін варыянт далейшага лёсу гэтых крыжоў. Вядома, што пад г. Рыга ўжо шмат дзесяцігоддзяў існуе сапраўдны музей крыжоў, які з'яўляецца чымсьці падобным на Галгофу — гара жаўтапёсу, а над ёй узвышаюцца тысячы розных па форме крыжоў. Гэты вопыт быў пераняты ксяндзом в. Мосар Глыбоцкага раёна. Мясцовыя могілкі ўваходзяць у вельмі прыгожы паркава-касцёльны ансамбль і выразна сведчаць аб тым, што могуць зрабіць людзі, аб'яднаныя адной ідэяй і вядомыя чалавеку, якому цалкам давяраюць. І вось на мясцовых могілках, якія размешчаны на пагорку, узведзена свая Галгофа, на якой таксама сабрана шмат крыжоў. Гэты вопыт можна смела пераймаць і такім чынам вырашыць праблему эстэтызацыі сакральнай прасторы могілак.

Па такім шляху захавання надмагільных крыжоў могуць пайсці і ў іншых рэгіёнах нашай краіны. Гэта можа быць невялікі па памерах насыпаны курган, які паступова — з году ў год — будзе абрастаць крыжамі і тым самым набываць статус сакральнай мясціны (нешта накшталт брацкай магілы ў пасляваенны час), вакол або побач якой будзе фарміравацца выключнае поле нашай адвечнай духоўнасці, поле прымірэння, узаемаразумення, спагады і літасцівасці.

Сёння ў многіх вёсках вяртаюцца на свае колішнія месцы крыжы—абярэгі, якія ставілі на пачатку вуліцы або на скрыжаванні дарог. Ён быў своеасаблівым цэнтрам вясковага свету; перад ім спынялася пахавальная працэсія, схілялі галаву для бласлаўлення маладыя, якія вярталіся з-пад вянца, хрысціўся той, хто кіраваўся ў далёкую дарогу.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

